УДК 172.1:378

# КРЫНІЦЫ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ-ТЭХНОЛАГАЎ ПАЛІГРАФІЧНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

М.К. Якаўлеў

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», г. Мінск*

У 2021 г. у нашай краіне прынятая Праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва на 2022–25 гг., у якой дакладна сфармуляваны базавыя паняцці: патрыёт, патрыятызм, патрыятычнае выхаванне, названыя патрыятычныя каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі. У Праграме вызначаны таксама мэты, задачы і шляхі патрыятычнага выхавання насельніцтва Беларусі. Яны звязаныя з фарміраваннем нацыянальнай ідэнтычнасці, духоўна-маральным, гісторыка-культурным, грамадзянска-патрыятычным і ваенна-патрыятычным выхаваннем. Адной з формаў гісторыка-культурнага выхавання вызначана папулярызацыя выдатных людзей Беларусі і яе гістарычных мясцін [1].

Патрыятычнае выхаванне фарміруе не толькі законапаслухмянага грамадзяніна, а чалавека, які свядома і актыўна выконвае свой грамадзянскі абавязак. Патрыятызм і грамадзянскасць выступаюць як складовыя элементы яго светапогляду і адносін да роднай краіны. Між тым паводле даследванняў, праведзеных, у прыватнасці, інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, назіраецца тэндэнцыя зніжэння статусу духоўна-маральных сямейных каштоўнасцяў і інстытуту шлюбу, частка выпускнікоў навучальных устаноў звязваюць сваю будучыню з працай за мяжой і ад’ездам [1, 2]. Гэта сведчаць аб існаванні праблем у грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі ўвогуле і студэнтаў ВНУ, у прыватнасці.

Для маладога пакалення і студэнтцкай моладзі гераічная мінуўшчына і багатая культурная спадчына нашай Бацькаўчыны – невычэрпная крыніца ведаў, гонару і натхнення. І, зразумела, выдатны матыватар для фарміравання сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці, духоўна-маральнага развіцця і актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

Гісторыка-культурнае выхаванне як важны аспект патрыятычнага выхавання студэнтаў нашай краіны мае трывалы падмурак. За тысячагадовую гісторыю беларускі народ стварыў найбагацейшую культуру высокага еўрапейскага ўзроўню і непаўторнае мастацтва. Вызначальнай рысай нашай культуры ёсць гуманізм як вынік сінтэзу старажытнабеларускіх і заходнееўрапейскіх традыцый.

Патрыятычным выхаваннем займаюцца ўсе кафедры ўніверсітэта, аднак факультэт прынттэхналогій валодае выключнымі магчымасцямі: у нас ёсць вялікі Францішак Скарына – адзін з найбольш выдатных гістарычных дзеячоў Беларусі: беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, перакладчык і выдавец беларускай Бібліі, філосаф, пісьменьнік, грамадзкі дзяяч, прадпрымальнік і лекар-навуковец. Імя асветніка носяць найвышэйшыя дзяржаўныя ўзнагароды, Гомельскі ўніверсітэт, гімназіі ў Полацку і Мінску. У яго гонар у розных краінах стаяць помнікі, выраблены скульптурныя і маляўнічыя выявы.

Пра дзейнасць і спадчыну нашага нацыянальнага генія, які стаў найбольш яркім прадстаўніком гуманістычнай традыцыі беларускай культуры ў эпоху Рэнесанса, напісаны тамы. Тут адзначым толькі, што Скарына – наш першы паліграфіст, кнігавыдавец і дызайнер.

Ён першым у кірылічным друку ўжыў тытульны ліст. Ілюстрацыі скарынавых выданняў служаць мастацкім сродкам для раскрыцця зместу і ўражваюць не толькі надзвычай вялікай колькасцю, але і дасканаласцю тэхнікі, высокай арыгінальнасцю і глыбокім псіхалагізмам. Кнігі Скарыны яскрава сведчаць, што наша кнігадрукаванне пачалося адразу з высокага еўрапейскага ўзроўню. «Глосы» на палях скарынавых выданняў былі першымі перакладнымі слоўнікамі, а выявай Скарыны ў пражскім выданні «Ісус Сірахаў» (1517 г.), калі ўпершыню на старонках Бібліі з'явіўся партрэт свецкага чалавека, распачаўся рэнесансавы кірунак у развіцці нашага жывапісу.

Не будзе перабольшаннем сцвердзіць, што наш патрыятызм пачаўся з вядомых скарынавых словаў: «*Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя, птици, летающие по воздуху, ведаюць гнёзда своя; рыбы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчёлы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, и где зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають*». Але Скарына не толькі прыгожа сказаў пра любоў да Бацькаўшчыны, але і засведчыў свой патрыятызм працай на карысць «люду паспалітаму», г. зн. народу. Яго патрыятызм – у дзейна-вартаснай форме засваення быцця, якая служыць канкрэтызацыяй «паспалітага добрага», г. зн. агульнага дабра.

Выхаванне ў студэнтаў і моладзі любові да Бацькаўшчыны – складаная і шматгранная задача. Маладое пакаленне найчасцей не ўспрымае павучанні і спробы навязаць ім чужыя рашэнні або ідэі. Прычына ў тым, што, дасягнуўшы пэўнага ўзросту, яны пачынаюць адчуваць сябе асобай, індывідуальнасцю. Маладыя людзі карыстаюцца пэўнымі ідэямі, калі яны становяцца іх асабістымі [3]. І гэта тычыцца любых сфераў выхавання, а не толькі патрыятызму.

Для выхавання патрыёта-грамадзяніна, ва ўніверсітэце створана цэласная сістэма выхаваўчай працы, а куратары вучэбных групаў і выкладчыкі дасканала валодаюць прыёмамі і формамі выхаваўчай працы. Да прыкладу, першы аб’ект, куды вядуць студэнтаў-першакурснікаў – гэта ўніверсітэцкі музей (зала гісторыі і адукацыі БДТУ) – важны крок у іх гісторыка-культурным выхаванні.

Асоба Скарыны мае неаспрэчную вялікую каштоўнасць для патрыятычнага выхавання студэнтаў, будучых спецыялістаў выдавецка-паліграфічнага комплексу Беларусі. У маладых людзей звычайна існуе патрэба для пераймання, і наша гісторыя пакінула шмат імёнаў, вартых таго. Але гэта можа быць і наш сучаснік, прыкладам, выкладчык. Калі ён дасканала валодае прафесіяй, мае выдатныя маральныя якасці і з’яўляецца патрыётам сваёй краіны, гэта спрацоўвае адназначна.

Патрыятычнае выхаванне студэнтаў належыць да прыярытэтных кірункаў ідэалагічнай працы ў ВНУ. Галоўнымі мэтамі патрыятычнага выхавання моладзі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца прывіццё моладзі любові да Беларусі, фарміраванне ў яе ўстойлівага жадання садзейнічаць яе росквіту і імкненню абараняць ад ворагаў. Выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму ў студэнцкай моладзі – мэтанакіраваная сістэматычная дзейнасць універсітэцкіх выкладчыкаў, усіх яго падраздзяленняў і грамадскіх арганізацый.

У былым СССР выхаванне савецкага патрыятызму грунтавалася на пралетарскім інтэрнацыяналізме. У самастойнай Беларусі яно грунтуецца на нацыянальных каштоўнасцях і лепшых традыцыях культуры нашага народа. Менавіта культура, інтэгруючы агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці, стварае духоўнае апірышча, якое дазваляе нам ганарыцца сваім гераічным мінулым, любіць сваю мову і прыгажосць роднай прыроды. І нарэшце, садзейнічае салідарнасці ўсіх грамадзян краіны незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, палітычных або рэлігійных перакананняў і кансалідуе грамадства дзеля будучыні Беларусі.

Літаратура

1. Официальный сайт Минобразования Беларуси. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://edu.gov.by. – Дата доступа: 8.02.2023.

2. Горельцев А. Г. Гражданско-патриотическое воспитание студентов в государственном техническом вузе : диссертация... канд. пед. наук : 13.00.01. – СПб., 2007. – 166 с.

3. Баярд, Р. Т. Як спраўляцца з праблемамі падлеткаў / Р. Т. Баярд, Дж. Баярд; пер. з англ. Л. С. Марціновіч, Н. А. Мяснікова. – Мінск, 1990. – 160 с.